русским языком и бывал неоднократно в России, это повлияло на восприятие Кавказа, который он мыслил как отпавшую от тела России часть. Как журналиста его влекло профессиональное и обывательское любопытство, и главной задачей было самостоятельно разобраться в ситуации, сложившейся в связи с распадом Российской империи. В определенной степени данныйтравелог может быть идентифицирован как взгляд извне на действия британской администрации на Кавказе, в ряды которой он не был инкорпорирован.

Критическое осмысление дает возможность исследователю выявить такие недостатки англичан, снижающие результативность управления, как незнание языков, поверхностное знакомство и игнорирование обычаев местной жизни. В противовес А. Роулинсону, который писал об упорядочивающем начале английской миссии, К. Бехгофер отметил внутреннюю несогласованность действий и слабую поддержку из Лондона. Побывав в Тбилиси, Ереване и Баку, он составил описания, позволяющие сформировать представление о положении дел на местах. Применительно, к ситуации в Армении журналист обратил внимание на высокие профессиональные качества представителя Англии Джорджа Грейси, которые не могли быть реализованы по причине плохих условий работы: малочисленный штат, отсутствие служебного автомобиля. В Баку условия были, но генерал Джордж Уолтон предпочитал сосредоточится на урегулировании проблем с добычей и транспортировкой нефти.

Северный Кавказ К. Бехгофер относит к «Деникинской России». В отличие от предыдущих двух авторов, он более осведомлен о делах в этом регионе Большого Кавказа. Так, о Горской республике он пишет, как о «маленьком гнезде интриги», полагая, что чрезмерное вмешательство разных военно-политических сил в его судьбу свело успех этого проекта к нулю.


1. Архипова, Е. В. Британский след на Южном Кавказе (1918–1919 годы) / Е. В. Архипова // Новая и новейшая история. – 2016. – №3. – С. 216–223.
2. Асоян, Т. М. Территориальные проблемы Республики Армении и британская политика:1918–1920 гг. : дисс. … канд. ист. наук / Т. М. Асоян. – М. : МГУС, 2005. – 289 с.
3. Денстервиль, Л. Британский империализм в Баку и Персии 1917–1918. (Воспоминания) / Л. Денстервиль. – Тифлис : Советский Кавказ, 1925. – 282 с.
4. Доного, Х. М. Британская Политика На Ближнем Востоке: Английская Миссия в Дагестане. 1918–1919 / Х. М. Доного // Avrasya Incelemeleri Dergisi (AVİD). – 2012. – №I/2. – С. 161–192.
5. Кукарцева, М.А. Политический нарратив – инструмент «формирования себя» в мировой политике / М.А. Кукарцева, З.Э. Валиева // Обозреватель-Obserever. – 2013. – № 4. – С.100–109.
6. Морозова, О. М. Британское присутствие на Кавказе в 1918–1919 гг. / О. М. Морозова // Британцы и народы Юга России: проблемы взаимовлияния: сборник научных статей / отв. ред. А. Н. Еремеева ; редкол. И. И. Горлова, Т. В. Коваленко, А. В. Крюков и др. – Краснодар: Экоинвест, 2015. – С.111–121.
7. Пантюхина, Т. В. Миссия «Данстерфорс»: британский экспедиционный корпус на Кавказском фронте в 1918 г. / Т. В. Пантюхина // Боевое братство и национальное единство народов северного Кавказа в годы Первой мировой войны: материалы международной научной конференции (Пятигорск 28–30 ноября 2014 г.). – Ставрополь: Изд-во СКФУ, 2015. – С.77–83.
8. Ушников, Э. А. К проблеме определения нарратива / Э. А. Ушников // Вестник ЧитГУ. – 2006. – № 4. – С.182–185.
9. Шпак, Г. В. Травелог: поиск универсальной дефиниции. Четыре стратегии репрезентации пространства / Г. В. Шпак // Преподаватель. XXI век. – 2016. – № 2. – Т. 3. – С. 261–277.
10. Bechhofer Roberts, C. E. In Denikin's Russia and the Caucasus, 1919–1920 / C. E. Bechhofer Roberts. – NewYork, 1971.
11. Rawlinson, A. Adventures in the Near East, 1918–1922 / A. Rawlinson. – New-York : Dodd. Mead and company, 1924. – 353 p.


**Бараноўскі А.В.**

## КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ФАРМІРАВАННЯ ПАЎНОЧНА-ЎСХОДНЯЙ АДМІНІСТРАЦЫЙНАЙ МЯЖЫ БССР (1919–1924 ГГ.)

Фарміраванне тэрытарыяльных межаў – складаны і супярэчлівы гістарычны працэс, паколькі станаўленне і змяненне межаў звязана з унутранай і знешняй палітыкай дзяржаў. Даволі складана ішло фарміраванне адміністрацыйнай мяжы паміж БССР і РСФСР на віцебска-пскоўскім памежжы. Паміж УЦВК РСФСР і ЦВК БССР вялася барацьба за адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў, якая скончы-



Репозиторий ВГУ

лася на карысць РСФСР, дадзеныя паветы ўвайшлі ў склад Пскоўскай губерні. Увядзенне ў навуковы ўжытак і аналіз крыніц па гісторыі фарміравання адміністрацыйнай мяжы БССР на лакальным узроўні, на наш погляд, уяўляе асаблівую цікавасць.

Увесь комплекс выяўленых крыніц для зручнасці аналізу мэтазгодна сістэматызаваць, абапіраючыся на прынятую ў сучасным крыніцазнаўстве класіфікацыю. У прыватнасці, у аснову даследавання ляглі дакументальныя крыніцы, якія дазволілі падрабязна прасачыць як адбывалася фарміраванне паўночна-усходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг.

Сярод дакументальных вылучаюцца заканадаўчыя крыніцы. Да іх адносяцца прававыя акты, што накіраваны на рэгуляванне грамадскіх адносін: Канстытуцыі, законы, указы, ўрадавыя пастановы. Дакументы заканадаўства і публічна-прававыя акты з'яўляюцца каштоўнай крыніцай пры вывучэнні гісторыі фарміравання адміністрацыйнай мяжы БССР за паказаны перыяд. Аднак варта памятаць, што “пісаны закон” не заўсёды адпавядае “рэальнаму закону”.

Другую групу дакументальных крыніц прадстаўляюць дакументы справаводства, што функцыянальна забяспечваюць прыняцце і рэалізацыю кіраўнічых рашэняў. Гэтая група ўключае арганізацыйна-распарадчую дакументацыю (пратаколы пасяджэнняў калегій, сходаў, з'ездаў, канферэнцый і т. п.), бягучую перапіску арганізацый і ўстаноў, планавую, уліковую, кантрольную і статыстычную дакументацыю.

Значная колькасць падобнага роду дакументаў захоўваецца ў дзяржаўных архівах. У прыватнасці, у нашым даследаванні ўжываліся дакументы з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Сярод іх найбольшую цікавасць уяўляюць распарадчыя дакументы і матэрыялы да іх, а таксама бягучая перапіска ЦК Камуністычнай партыі Беларусі, якія захоўваюцца ў фондзе 4п – Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі Беларусі (вопіс 1), копіі дадзеных дакументаў змяшчаюцца ў фондзе 60п – Інстытут гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б (вопіс 3). Знаёмства з дакументамі, што захоўваюцца у дадзеных фондах, дазваляе даследаваць пазіцыі цэнтральных і мясцовых органаў улады адносна адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці тэрыторыі Віцебскай губерні.

Важныя для даследавання звесткі знаходзяцца ў фондах 6 (Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР) (вопіс 1) і 31 (Дзяржаўная планавая камісія пры Эканамічнай нарадзе БССР) (вопісы 1, 2) Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Гэта ў асноўным прававыя акты, што былі прыняты па пытанні вяртання часткі тэрыторыі Віцебскай губерні ў склад Беларускай рэспублікі і фарміравання паўночна-усходняй адміністрацыйнай мяжы БССР.

Частка новых дакументаў па гісторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльных пераўтварэнняў на Віцебшчыне намі выяўлена ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (фонды 3316 – Цэнтральны выканаўчы камітэт СССР (вопісы 16, 64), 5677 – Адміністрацыйная камісія пры Прэзідыуме Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта (вопісы 1,4)). У дадзеных фондах знаходзяцца распарадчыя дакументы па раянаванню Віцебскай губерні, вяртанню ў склад БССР усходнебеларускіх тэрыторый і вызначэнні мяжы паміж РСФСР і БССР на віцебскім-пскоўскім участку.

Трэцім архівам, дакументы якога былі пакладзены ў аснову даследавання, стаў Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Намі былі выкарыстаны пратаколы пасяджэнняў Палітбюро ЦК РКП(б), якія ўтрымліваюцца ў фондзе 17 – Цэнтральны Камітэт КПСС (вопіс 3).

Пры напісанні дысертацыі таксама выкарыстоўваліся дакументы рэгіянальных архіваў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Так асноўную частку дакументальных крыніц складаюць матэрыялы фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці: 56 – Віцебскі губернскі Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт, 1821 – Аддзел кіравання выканаўчага камітэта Віцебскага губернскага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, 118 – Віцебскі акруговы Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт, 10050-п – Віцебскі губернскі камітэт Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў), 10052-п – Віцебскі павятовага-гарадскі камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі і іншыя. Сярод іх найбольшую цікавасць уяўляюць пратаколы пасяджэнняў Віцебскага губкама і губвыканкама, а таксама перапіска, што вялася паміж мяцовымі ўладамі і кіраўніцтвам РСФСР і БССР. Дадзеныя дакументы з'яўляюцца

Рэпазіторый ВДУ

каштоўнай крыніцай і даюць магчымасць даследаваць пазіцыі цэнтральных, рэспубліканскіх і губернскіх органаў улады адносна адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці тэрыторыі Віцебскай губерні і фарміравання паўночна-усходняй адміністрацыйнай мяжы БССР.

Даклад аб рабоце і пратаколы пасяджэнняў Беларуска-Пскоўскай пагаджальнай камісіі, што займалася перадачай Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў Віцебскай губерні ў склад Пскоўскай, захоўваюцца ў фондзе Р–590 (Пскоўскі губернскі Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў) Дзяржаўнага архіва Пскоўскай вобласці.

У даследаванні прадстаўлены таксама дакументы з фондаў Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Орша (фонд 1358 – Сенненскі павятовы Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт) і Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Полацк (фонд 51 – Полацкі павятовы Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт).

Апублікаваныя ў тэматычных зборніках дакументаў матэрыялы таксама з'яўляюцца важнай крыніцай па гісторыі фарміравання паўночна-усходняй адміністрацыйнай мяжы БССР. У 2012 г. быў выдадзены першы том зборніка "Государственные границы Беларуси" [1]. Матэрыялы дадзенага зборніка адлюстроўваюць гісторыю фарміравання тэрытарыяльна-дзяржаўных межаў Беларусі ў 1917–1926 гг., а таксама ўзаемаадносіны Беларускай рэспублікі з суседнімі дзяржавамі. Асноўная частка ўключаных у зборнік дакументаў была выяўлена ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі. У першым томе таксама шырока прадстаўлены матэрыялы перыядычнага друку і дакументальных выданняў.

Падчас даследавання таксама выкарыстоўваліся апублікаваныя дакументы і матэрыялы са зборніка дакументаў "Витебская губерния 1917 – 1924 гг. Документы и материалы" [2]. Дадзены зборнік быў падрыхтаваны віцебскімі архівістамі разам з супрацоўнікамі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. У ім на падставе дакументаў з фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі адлюстравана дзейнасць мясцовых органаў улады і РКП(б), змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні Віцебскай губерні, у тым ліку перадача БССР паветаў з пераважным беларускім насельніцтвам.

Зборнікі дакументаў, як крыніца, маюць суб'ектыўны характар, паколькі складальнікі на падставе ўласных меркаваняў вызначаюць матэрыялы, якія будуць апублікаваны ў зборніку, але пры гэтым нельга казаць, што апублікаваныя дакументы і матэрыялы ў выкарыстаных намі зборніках дакументаў не аб'ектыўныя.

Нягледзячы на велізарны масіў апублікаваных крыніц, у даследаванні выкарыстоўвалася значная колькасць дакументаў і матэрыялаў справаводства, якія нідзе да гэтага часу не публікавалася і ўпершыню ўводзіцца ў навуковы абарот.

Асобную групу крыніц, выкарыстаных у даследаванні, складаюць публікацыі ў перыядычным друку, прадстаўленыя губернскімі газетамі: "Известия Витебского губисполкома и губкома РКП(б)" і "Псковский набат". Перыёдыка разглядаецца асобна як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц, паколькі яна ўтрымлівае творы аналітычнага, мастацка-публіцыстычнага жанраў, заканадаўчыя і актавыя дакументы, мемуарныя творы і г.д.

На старонках віцебскай губернскай газеты публікаваліся афіцыйныя пастановы мясцовых улад, матэрыялы пра далучэнне часткі тэрыторыі Віцебскай губерні да БССР, гістарычныя нарысы мясцовага даследчыка А. Сапунова пра беларусаў, а таксама асвятляўся прыезд Беларускай камісіі ў Віцебск. У сваю чаргу, пскоўская губернская газета знаёміла сваіх чытачоў з далучанымі паветамі былой Віцебскай губерні, пачала весціся пастаянная рубрыка "По новым местам".

Такім чынам, разгледжаны намі комплекс крыніц прадстаўлены разнастайнымі па ступені навуковай значнасці, паўнаце і шыраце ахопу дакументамі і матэрыяламі, дазваляе аб'ектыўна прасачыць як адбывалася фарміравання паўночна-ўсходняй адміністрацыйнай мяжы БССР у 1919–1924 гг.

1. Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов. В 2 т. Т. 1. (март 1917 – ноябрь 1926) / сост. : В. Е. Снапковский [и др.]. – Минск : БГУ, 2012. – 495 с.
2. Витебская губерния 1917–1924 гг. : док. и материалы / сост. : Н. В. Воронова [и др.] ; ред. кол. : В. И. Адамушко [и др.]. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2012. – 408 с.

Репозиторий ВГУ